ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
4
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 31 (1369)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫЯ

прафсаюзныя канферэнцыі адбыліся на ўсіх факультэтах універсітэта. Канферэнцыі прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні. Асабліва вызначыліся ФПМ, механіка-матэматычны, філалагічны факультэты.

Л. КАМАІШКА,
студэнтка журфака.

### УРАЧЫСТЫ СХОД

прадстаўнікоў калектываў БДУ імя У. І. Леніна і ВА «Інтэграл», прысвечаны 65-й гадавіне Вялікага Кастрычніка, адбыўся ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Вечар завяршыўся святочным канцэртам, у якім прынялі ўдзел калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта.

І. БАРДЗІЯН,
студэнтка журфака.

### НАРОДНАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА

універсітэта рыхтуе новую праграму для ўдзелу ў конкурсе змешаных акадэмічных хораў «Ювэнтус», які адбудзецца ў горадзе Каўнасе.

І. МАЦЮХОЎ,
мастацкі кіраўнік капэлы.

### АГЛЯД-КОНКУРС

самадзейнасці першакурснікаў прайшоў на фізічным факультэце БДУ імя У. І. Леніна. Амаль усе групы першага курса падрыхтавалі па некалькі канцэртных нумароў. Згодна з аднадушным меркаваннем прысутных і канчатковым рашэннем журы, першае месца было прысуджана чацвёртай групе.

Пераможцы асабістага першынства ў розных відах мастацтва будуць выступаць на ўрачыстым вечары факультэта, прысвечаным Міжнароднаму дню студэнтаў.

А. ГРЫШКЕВІЧ,
студэнтка журфака.

### СТУДЭНЦКАЕ КАФЭ

«Гаўдэамус» пачынае сваю работу. Кафэ працуе з 19 да 23 гадзін. У кафэ можна арганізаваць вечары адпачынку, праводзіць агляды мастацкай самадзейнасці. У арганізацыі культурнай праграмы прымуць удзел калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта, творчыя групы факультэтаў.

В. ГРЭЛЬ,
студэнтка біяфака.



Ала ШАРЭЙКА,
студэнтка філфака.

*Даў Кастрычнік*
*Шчасце і свабоду,*
*Светлае жыццё*
*Нам падарыў,*
*Аб'яднаў савецкія народы,*
*Ім шляхі*
*У будучынь адкрыў.*
*Мы жывём*
*Вялікаю сям'ёю,*
*Нас ніякай сіле не скарыць.*
*Мы народ вясны,*
*Народ герояў. —*
*Завяшчаў Ільіч нам гэтак жыць.*
*Паглядзі,*
*Любімы, родны Ленін,*
*На прастор,*
*Ад песень гаманкі.*
*Паглядзі*
*На наша пакаленне —*
*Дзён наступных*
*Мы будаўнікі!*
*Акрылёны*
*Росквітам Радзімы,*
*Сонцам*
*Канстытуцыі сваёй,*
*Пераможна*
*Мой народ узніме*
*Камунізму сцяг*
*Па-над зямлёй!*

# ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ ВЕКУ

У СВЯТОЧНЫМ УБРАННІ плошчы і вуліцы гарадоў і вёсак. У рытме працоўнага дня, у словах і справах людзей адчуваецца набліжэнне вялікага свята.

65 гадоў прайшло з таго дня, калі ў Расіі перамагла сацыялістычная рэвалюцыя, калі рабочы клас разам з працоўным сялянствам, на чале з партыяй вялікага Леніна, знішчылі эксплуататарскі лад капіталістаў і памешчыкаў і ўсталявалі дыктатуру пралетарыяту. У полымі рэвалюцыйных бітваў узнікла першая ў свеце сацыялістычная дзяржава — Краіна Саветаў, якая стала несакрушальнай апорай сацыяльнага прагрэсу, дэмакратыі і міру.

Кастрычнік адкрыў новую эпоху — эпоху пераходу чалавецтва ад капіталізму да сацыялізму, рэвалюцыйнага абнаўлення свету.

— НЯХАЙ ЖЫВЕ 65-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ!

І чым далей адыходзяць ад нас гістарычныя падзеі Кастрычніка 1917 года, тым глыбей разумеем мы веліч подзвігу тых, хто з самаадданай мужнасцю ішоў на штурм старога свету, тым выразней становіцца для нас значэнне пралетарскай рэвалюцыі, тым мацней усведамляем мы веліч гіганцкай фігуры Уладзіміра Ільіча Леніна, правадыра рэвалюцыі, геніяльнага мысліцеля, нязломнага рэвалюцыянера, заснавальніка партыі бальшавікоў. Гэта з яе імем — імем Камуністычнай партыі — звязаны ўсе нашы перамогі, наш упэўнены рух наперад.

— НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗА!

У АДЗІНСТВЕ З НАРОДАМ— СІЛА ПАРТЫІ!

У АДЗІНСТВЕ З ПАРТЫЯЙ, У ЯЕ КІРАЎНІЦТВЕ — СІЛА НАРОДА!

Кастрычніцкая рэвалюцыя вывела краіну на шлях незалежнага развіцця і прагрэсу, азнаменавала гістарычны паварот у лёсах народаў Расіі. Ужо першыя мерапрыемствы Савецкай улады раскрылі глыбока рэвалюцыйную сутнасць новай дзяржавы.

Ленінскі дэкрэт аб міры — першы дзяржаўны акт Савецкай улады — абвясціў праграму барацьбы за справядлівы дэмакратычны мір. У гэтым дэкрэце была закладзена ідэя мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам, якая стала затым адным з галоўных прынцыпаў савецкай знешняй палітыкі.

— НАРОДЫ СВЕТУ! ПРЫХІЛЬНІКІ МІРУ! ПАМНАЖАЙЦЕ СВАЕ НАМАГАННІ Ў СВЯШЧЭННАЙ БАРАЦЬБЕ ЗА САМАЕ ВЯЛІКАЕ ПРАВА — ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ!

«НЕ» — ЯДЗЕРНАЙ ВАЙНЕ! СВЕТУ — МІР!

Вялікі Кастрычнік узняў на барацьбу за сацыялізм усе нацыі і народнасці Расіі. У гэтай барацьбе ўмацавалася брацкае адзінства рабочага класа, усіх працоўных краіны. Няўхільна праводзячы ленінскую палітыку, Савецкая дзяржава паслядоўна дабівалася пераадолення эканамічнай і культурнай адсталасці нацыянальных ускраін, наладжвала ўсебаковае супрацоўніцтва народаў, якія ў снежні 1922 года аб'ядналіся ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

— НЯХАЙ ЖЫВЕ 60-ГОДДЗЕ ЎТВАРЭННЯ САЮЗА ССР — СВЯТА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА АДЗІНСТВА, ДРУЖБЫ І БРАЦТВА ЎСІХ САВЕЦКІХ НАРОДАЎ!

— ГРАМАДЗЯНЕ САВЕЦКАГА САЮЗА! СУСТРЭНЕМ СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ НОВЫМІ ПОСПЕХАМІ Ў ПРАЦЫ, ВУЧОБЕ, ТВОРЧАСЦІ!

З першых дзён Савецкай улады партыя, праводзячы вялікую работу па пераадоленню векавой адсталасці краіны, стварыла прынцыпова новую сістэму народнай асветы, здольнай за кароткі адрэзак часу забяспечыць усеагульную адукаванасць насельніцтва, хуткі ўздым навукі і культуры, выхаванне падрастаючага пакалення. Вядучая роля ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, сапраўдных майстроў сваёй справы належыць вышэйшым навучальным установам, сярод якіх і адзін з буйнейшых навуковых і культурных цэнтраў рэспублікі — Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна.

Адзначаючы 65-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка і ідучы насустрач шасцідзесяцігоддзю ўтварэння СССР, студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі флагмана вышэйшай школы рэспублікі поўныя рашучасці і надалей памнажаць плённыя здабыткі ў вучобе і навуковым пошуку.

Са святам Кастрычніка, таварышы!

ПАРТКОМ
РЭКТАРАТ
МЯСЦКОМ
КАМІТЭТ КАМСАМОЛА
ПРАФКОМ

# САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

ПАСПЯХОВА АБАРАНІЛІ КАНДЫДАЦКІЯ ДЫСЕРТАЦЫІ:

**ГАРАДЗЕЦКІ ЛЕАНІД МІХАЙЛАВІЧ** — ВЦ, навуковы кіраўнік дацэнт **УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ БАБКОЎ;**

**ВУ КУОК ХАНЬ** — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар **ФАІНА МІХАЙЛАЎНА КІРЫЛАВА;**

**ФРАНСІСКА КАСЦІЛЬА АРАНГУРЭН** — ФПМ, навуковы кіраўнік дацэнт **ВІКТАР ІВАНАВІЧ КАРЗЮК;**

**ЛЕБЕДЗЕЎ УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ** — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік прафесар **АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ ЧАРНЯЎСКІ;**

**ЦІХАНЕНКА АЛЕГ МІХАЙЛАВІЧ** — факультэт радыёфізікі і электронікі, навуковы кіраўнік прафесар **АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ ЧАРНЯЎСКІ;**

**САКАРАС МАРАЛЕС АЛЬФРЭДА** — хімічны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар **ФЁДАР МІКАЛАЕВІЧ КАПУЦКІ;**

**ГЛАЗКОВА ЛІДЗІЯ МІКАЛАЕЎНА** — геаграфічны факультэт, навуковы кіраўнік дацэнт **МІКАЛАЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ ЧАРТКО;**

**МУХАМЕД АЛЬ ФАЦІХ МАХДЗЯЛУБ** — філалагічны факультэт, навуковы кіраўнік дацэнт **ЛЮДМІЛА АЛЯКСАНДРАЎНА ШАЎЧЭНКА;**

**САГЛАЕВА ЛАРЫСА АЛЯКСЕЕЎНА** — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **ІВАН ІВАНАВІЧ АНТАНОВІЧ;**

**КАЗАКЕВІЧ ЛЕАНІД АЛЯКСАНДРАВІЧ** — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі прафесар **ВАЛЯНЦІН ДЗМІТРЫЕВІЧ ТКАЧОЎ**, дацэнт **ПЁТР ФЁДАРАВІЧ ЛУГАКОЎ;**

**ПАКЛОНСКІ МІКАЛАЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ** — НДІ ПФП, навуковыя кіраўнікі прафесар **ВАЛЯНЦІН ДЗМІТРЫЕВІЧ ТКАЧОЎ**, дацэнт **ВЯЧАСЛАЎ ФАМІЧ СТЭЛЬМАХ;**

**МЕЖАНЦОЎ ВАСІЛІЙ АНАТОЛЬЕВІЧ** — НДІ ПФП, навуковы кіраўнік прафесар **ІВАН РЫГОРАВІЧ ЦІШЧАНКА;**

**СЯМЁНАВА ВЕРА АЛЯКСЕЕЎНА** — НДІ ФХП, навуковыя кіраўнікі дацэнт **ІВАН ПАЎЛАВІЧ ЗЯЦЬКОЎ**, прафесар **СЯРГЕЙ СЦЯПАНАВІЧ ІВАНЧАЎ.**

**БАНДАРЭНКА КАНСТАНЦІН МІХАЙЛАВІЧ** — кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **ТАЦЦЯНА ІВАНАЎНА ПРЫТЫЦКАЯ.**

Жадаем новых творчых поспехаў!



# ПЯСНЯР ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

**Імя Якуба Коласа — славутага сына беларускага народа, выдатнага паэта, празаіка і драматурга, аднаго з заснавальнікаў беларускай савецкай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы — вядома ўсяму свету.**

**У яго творах знайшло яскравае адлюстраванне жыццё працоўнага народа як да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, так і ў савецкі час.**

**Якуб Колас на працягу ўсяго свайго жыцця быў сапраўдным песняром дружбы народаў, дружбы спрадвечнай і непарушнай.**

**Вялікі Кастрычнік вызваліў працоўных ад сацыяльнага і нацыянальнага зняволення і адкрыў новую эру ў жыцці ўсяго чалавецтва.**

**Якуб Колас з вялікай радасцю вітае ясны і радасны час, услаўляе маладую Краіну Саветаў, ганарыцца яе поспехамі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Ён справядліва адзначае, што толькі дзякуючы мудрай нацыянальнай палітыцы Камуністычнай партыі народы Савецкага Саюза атрымалі мажлівасць па-сапраўднаму сябраваць між сабой. Аб гэтым яскрава сведчаць такія яго цудоўныя вершы, як «Народам СССР», «Прывітанне Маскве», «Джамбулу», «Жыве Руставелі», «Узбекістану», «Салар» і многія іншыя.**

**Дзякуючы непарушнай дружбе і згуртаванасці савецкі народ перамог у Вялікай Айчыннай вайне, адбудаваў разбураную фашысцкімі захопнікамі народную гаспадарку, а зараз упэўнена набліжае светлую і доўгачаканую яву. І ў нашы дні неўміручае слова паэта — усюды разам з савецкімі людзьмі, дапамагае ім жыць, змагацца, працаваць.**

ЯКУБ КОЛАС

## Сябрам-студэнтам

Дарагія студэнты і студэнткі!

Ад усяго сэрца прыношу вам і вашым прафесарам і выкладчыкам маю глыбокую падзяку за вашы добрыя словы і пажаданні і за тую пашану, што аказалі вы мне ў дзень майго сямідзесяцігадовага юбілею.

Дарагія таварышы, студэнты і моладзь!

У вас ёсць тры бясцэнныя дары, якім я магу толькі пазайздросціць, у той жа час і парадавацца. Першы дар — ваша моладасць, сіла, жыццярадаснасць. Другі дар—прасторныя, шырокія дарогі ў жыццё, якія расчыніла перад вамі партыя Леніна і наш Савецкі ўрад. Трэці ваш дар... сягоння яго яшчэ няма ў вас, але ён павінен быць, яго вы абавязаны здабыць — вашаю чэснаю, прынцыповаю, адданаю працаю на славу нашай сацыялістычнай Радзімы, партыі і народа. Гэты ваш дар можа і павінен праявіцца ў мнагаграннай вашай дзейнасці і дзейнасці савецкіх людзей. А для гэтага вам трэба вучыцца і вучыцца, і не толькі ў сценах універсітэта і інстытутаў, але і па-за іх межамі.

Што ён такое, ваш трэці дар?

Гэта ваш уклад у навуку, у паэзію, у мастацтва, у справу будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Жыццё наша — бурнае веснавое разводдзе. Яно не стаіць на месцы, яно развіваецца з дня ў дзень.

Мой запавет вам: ідзіце ў нагу з жыццём, не адставайце, апераджайце яго. Не закапайце ў зямлю вашых дараў, а прымнажайце і аддайце іх народу, Камуністычнай партыі, якія росцяць і выхоўваюць вас.

Жадаю вам поспехаў ад усёй душы.

Няхай жыве наша савецкая моладзь!

(Прамова Я. Коласа 13 лістапада 1952 г.).




## Вечна жывое слова

З КОЖНЫМ ГОДАМ расце папулярнасць твораў Якуба Коласа. Вершы і паэмы, аповесці і апавяданні песняра чытаюць сёння далёка за межамі рэспублікі: на Украіне і ў Казахстане, у Прыбалтыцы і на Далёкім Усходзе. Імя Коласа-паэта называюць сёння разам з імёнамі Шэкспіра, Дантэ, Гётэ.

— Надзённасць твораў вялікага сына беларускага народа, іх сучаснасць, вастрыня тэм і багацце вобразаў — усё гэта, як нельга лепш, спрые іх папулярнасці,— гаворыць супрацоўніца бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна З. М. Шалупенка.— Вось, напрыклад, радкі з кнігі водгукаў на адкрыты прагляд літаратуры, прысвечаны юбілею пісьменніка:

**«Асабліва адабраю падборку літаратуры, якая паказвае аўтарытэт Я. Коласа сярод народаў нашай краіны». (М. Часноўскі, кафедра гісторыі СССР).**

**«З цікавасцю прагледзелі выстаўку. Метадычныя распрацоўкі па творчасці Якуба Коласа дапамагаюць пры выкананні курсавых і дыпломных работ». (Студэнты-філолагі).**

— Сёння мала гаварыць аб папулярнасці Коласа. Сёння патрэбна гаварыць аб любві да яго,— працягвае Зінаіда Максімаўна.

Кнігі Якуба Коласа — жывая сувязь пакаленняў, яны навечна ўвайшлі ў скарбонку нашай шматнацыянальнай літаратуры.

**Л. ФІЛІМОНАВА.**

ХРОНІКА СУВЯЗЕЙ

# Якуб Колас і БДУ

**1922 ГОД**

**30 красавіка.**

На факультэце грамадскіх навук БДУ адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае Я. Коласу. Адкрыў пасяджэнне рэктар універсітэта У. Пічэта. З дакладам «Якуб Колас як нацыянальны беларускі паэт» выступіў М. Пятуховіч. Я. Колас прачытаў урывак з паэмы «Новая зямля». Беларускі хор Равінскага выканаў песні на словы Я. Коласа.

**1923 ГОД**

**28 верасня.**

Я. Колас падае заяву ў Літаратурную прадметную камісію БДУ з просьбай залічыць яго асістэнтам па кафедры беларускай мовы. Да заявы прыкладае разгорнутую аўтабіяграфію са спісам усіх выдадзеных на той час кніг. 6 кастрычніка заява разгледжана прадметнай камісіяй, і кандыдатура Я. Коласа прызнана «вельмі пажаданай». 3 лістапада праўленне БДУ пад старшынствам рэктара У. Пічэты пацвердзіла абранне паэта на пасаду выкладчыка беларускай мовы на педагагічным факультэце універсітэта. 3 снежня загадам Наркамасветы БССР Я. Колас зацверджаны дацэнтам БДУ.

**2 снежня.**

Адбылося пасяджэнне Навуковага таварыства пры БДУ, прысвечанае Я. Коласу. Адкрыў пасяджэнне рэктар У. Пічэта.

**1925 ГОД**

**Сакавік.**

Дацэнт БДУ Я. Колас па камандзіроўцы Наркамасветы БССР едзе ў Калінінскую акругу для чытання лекцый па беларусазнаўству. У пасведчанні, выдадзеным паэту 16 сакавіка, запісана: «Міцкевіч мае чытаць лекцыі, весці гутаркі па гісторыі беларускай літаратуры, чытаць свае творы і іншыя ўзоры прыгожага беларускага пісьменства. Народны Камісарыят асветы БССР просіць усе савецкія і грамадзянскія ўстановы дапамагаць Міцкевічу ў выкананні ўскладзенага на яго задання».

**1926 ГОД**

**31 кастрычніка.**

Я. Купала і Я. Колас прысутнічаюць на ўрачыстым пасяджэнні БДУ, прысвечаным 25-годдзю навуковай дзейнасці рэктара універсітэта прафесара У. І. Пічэты.

**1927 ГОД**

Драматычны гурток БДУ ажыццявіў пастаноўку п'есы Я. Коласа «Забастоўшчыкі». На прэм'еры прысутнічаў аўтар.

**1929 ГОД**

**15 сакавіка.**

Я. Купала і Я. Колас калектывам студэнтаў і выкладчыкаў педфака БДУ вылучаны дэпутатамі ў Мінскі гарадскі савет.

**1946 ГОД**

**24 лістапада.**

Адбылося ўрачыстае пасяджэнне вучонага савета БДУ. прысвечанае 40-годдзю літаратурнай і грамадскай дзейнасці Я. Коласа. З прывітальнымі прамовамі выступілі рэктар універсітэта П. Савіцкі і дацэнт М. Жыркевіч. Вершы, прысвечаныя юбіляру, чыталі П. Броўка, М. Танк, М. Лужанін. Я. Колас прачытаў некалькі сваіх вершаў.

**1951 ГОД**

**Студзень—сакавік.**

Дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры БДУ Ю. Пшыркоў выдаў крытыка-біяграфічны нарыс «Якуб Колас. Жыццё і творчасць».

**1952 ГОД**

**13 лістапада.**

У актавай зале Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага адбыўся вялікі літаратурны вечар студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, прысвечаны 70-годдзю Я. Коласа. Даклад аб жыцці і творчасці народнага паэта зрабіў дацэнт універсітэта Ю. Пшыркоў. З прывітаннямі ў адрас юбіляра выступілі прафесар І. Гутараў, дацэнт Н. Рагозін, сакратар партбюро БДУ імя У. І. Леніна В. Старавойтаў і іншыя. Беларускія паэты В. Прыходзька, М. Лужанін, Э. Агняцвет і студэнт філалагічнага факультэта Н. Гілевіч прачыталі свае вершы, прысвечаныя Я. Коласу. Са словам у адказ выступіў юбіляр.

**1953 ГОД**

**Да 14 лістапада.**

М. Я. Цікоцкім абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму «Публіцыстыка Я. Коласа».

**15 снежня.**

В. В. Казлова абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму «Трылогія Якуба Коласа («У палескай глушы», «У глыбіні Палесся», «На ростанях»)».

**1954 ГОД**

**22 чэрвеня.**

І. Я. Навуменка абараніў кандыдацкую дысертацыю «Тэма працы ў творчасці Якуба Коласа».

**1956 ГОД**

**16 жніўня.**

Пастановай ЦК КП Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР «Аб увекавечанні памяці народнага паэта БССР Якуба Коласа (Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча)» у БДУ імя У. І. Леніна і Мінскім педагагічным інстытуце імя А. М. Горкага ўстаноўлены стыпендыі імя Я. Коласа.

**1959 ГОД**

**Жнівень.**

Выйшла кніга прафесара БДУ імя У. І. Леніна Л. Фіглоўскай «Творчасць Якуба Коласа», якая створана на аснове дысертацыі, абароненай на годнасць доктара філалагічных навук.

**1960 ГОД**

**Люты.**

Выйшла з друку кніга І. Навуменкі «З глыбінь жыцця. Крытычныя эцюды аб творчасці Якуба Коласа».

**1961 ГОД**

**Кастрычнік.**

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна А. Лойка выдаў манаграфію «Новая зямля» Якуба Коласа. Вытокі. Веліч. Хараство».

**1962 ГОД**

**15 лістапада.**

У актавай зале галоўнага корпуса БДУ імя У. І. Леніна адбыўся агульнауніверсітэцкі літаратурны вечар, прысвечаны 80-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

**1966 ГОД**

**Верасень.**

У актавай зале філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна адбылося расшыранае пасяджэнне кафедры беларускай літаратуры, прысвечанае 60-годдзю літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа. Адкрыў пасяджэнне загадчык кафедры прафесар М. Ларчанка. З дакладам аб творчым шляху народнага паэта Беларусі выступіў дацэнт С. Александровіч. Прысутныя цёпла сустрэлі брата Якуба Коласа Іосіфа Міхайлавіча Міцкевіча, які расказаў шмат цікавага пра свайго брата, а затым прадэкламаваў урыўкі з паэмы «Новая зямля».

**1968 ГОД**

**Кастрычнік—снежань.**

Выйшла ў свет манаграфія дацэнта кафедры беларускай літаратуры БДУ І. Навуменкі «Якуб Колас. Духоўны воблік героя».

**1969 ГОД**

**29 красавіка.**

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна І. Навуменка абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук на тэму «Канцэпцыя чалавека ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа».

**1972 ГОД**

**Люты.**

У выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна выйшла кніга дацэнта кафедры беларускай літаратуры БДУ В. Рагойшы «Пераклаў Якуб Колас...»

**12 лістапада.**

На філалагічным факультэце адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Я. Коласа. Да юбілею на факультэце разгорнута вялікая выстаўка кніг песняра і літаратурна-крытычных прац пра яго творчасць.

**На працягу года.**

Выйшла ў свет новая дакументальная аповесць пра Я. Коласа «На шырокі прастор» дацэнта кафедры беларускай літаратуры С. Х. Александровіча (першая аповесць «Ад роднай зямлі...»—паявілася ў 1962 годзе).

Выдавецтвам БДУ выпушчаны зборнік артыкулаў вучоных філфака «Народныя песняры», прысвечаны творчасці Я. Купалы і Я. Коласа.

**1981 ГОД**

Выйшла ў свет даследаванне дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі У. Н. Радзіёнава «Якуб Колас — педагог».

**1982 ГОД**

У выдавецтве БДУ выйшаў з друку навуковы зборнік «З глыбінь народных», цалкам складзены з новых даследаванняў пра Я. Коласа, напісаных супрацоўнікамі кафедры беларускай літаратуры.

**14—15 кастрычніка.**

На філалагічным факультэце адбылася рэспубліканская канферэнцыя «Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур».

**Хроніку падрыхтавалі дацэнты кафедры беларускай літаратуры В. П. РАГОЙША і К. Р. ХРОМЧАНКА.**

# ПАЭТАМ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

**БУДУЧЫ заснавальнікамі новага метаду сацыялістычнага рэалізму ў беларускай савецкай літаратуры, Янка Купала і Якуб Колас на многія гады наперад прадвызначылі шляхі яе развіцця. У апошнія дзесяцігоддзі актыўнае развіццё атрымала купалазнаўства і коласазнаўства. Сведчанне гэтага — навуковая рэспубліканская канферэнцыя «Творчая спадчына Я. Купалы і Я. Коласа і развіццё славянскіх моў і літаратур», якая не так даўно прайшла ў сценах БДУ імя У. І. Леніна, дзе калісьці працаваў Колас і неаднойчы выступаў Купала.**

**Завяршылася канферэнцыя пасяджэннем за «круглым сталом». Тэма гутаркі гучала так: «Асоба вялікага пісьменніка і яе ўплыў на літаратурны працэс». Сваімі думкамі, успамінамі пра Якуба Коласа і Янку Купалу падзяліліся Герой Сацыялістычнай Працы, народны пісьменнік Беларусі Іван Пятровіч ШАМЯКІН, загадчык рэдакцыі БелСЭ, кандыдат філалагічных навук Іван Уладзіміравіч САЛАМЕВІЧ, заслужаны работнік культуры БССР, старшы навуковы супрацоўнік музея Якуба Коласа, сын пісьменніка Даніла Канстанцінавіч МІЦКЕВІЧ, галоўная захавальніца фондаў музея Янкі Купалы, пляменніца паэта Ядвіга Емяльянаўна РАМАНОЎСКАЯ, літаратуразнаўца Уладзімір Міхайлавіч ЮРЭВІЧ, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, паэтэса Яўгенія ЯНІШЧЫЦ, дацэнт кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна Уладзімір Аляксандравіч НАВУМОВІЧ, а таксама госці з братніх саюзных рэспублік і Балгарыі.**

**Вёў «круглы стол» прафесар кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна Алег Антонавіч ЛОЙКА.**

*Самым дарагім для нас у беларускай літаратуры побач з імем незабыўнага Янкі Купалы з'яўляецца імя Якуба Коласа. Неўміручыя творы гэтых волатаў беларускай літаратуры знайшлі шырокі шлях да сэрца працоўнага чалавека яшчэ ў змрочную пару царызму. У савецкі перыяд творы іх, узнятыя на яшчэ большую ідэйную і мастацкую вышыню, сталі здабыткам шырокіх працоўных мас не толькі Беларусі, але і ўсяго Савецкага Саюза, увайшлі ў залаты фонд сусветнай літаратуры.*

*КАНДРАТ КРАПІВА.*



**А. А. ЛОЙКА:** З глыбокай пашанай і бязмернай любоўю адзначыла грамадскасць краіны стогадовы юбілей вялікага песняра беларускай зямлі — Янкі Купалы. І вось зноў у нас вялікае свята — стагоддзе з дня нараджэння яго равесніка, сябра і саратніка Якуба Коласа. Перад нашымі вачыма як жывыя паўстаюць яркія і каларытныя вобразы іх твораў, якія палюбіліся нам яшчэ з дзяцінства.

У памяці тых, хто бачыў Купалу і Коласа жывымі, хто меў шчасце сустракацца з імі, на ўсё жыццё захаваліся і незабыўныя вобразы паэтаў. Кожны з іх сёння рад падзяліцца дарагімі ўспамінамі аб сустрэчах з вялікімі паэтамі, якія так шчодра дарылі людзям цеплыню сваёй душы і скарбы свайго таленту.

**І. П. ШАМЯКІН:** Самае першае і, бадай, самае моцнае ўражанне Якуб Колас зрабіў на мяне яшчэ задоўга да асабістага знаёмства з ім. Падлеткам я вельмі любіў чытаць кнігі. Чытаў іх запоем. Аднойчы бацька-ляснік прынёс мне кніжку. Яна расчуліла мяне да слёз. Потым даведаўся, што гэта «Новая зямля» Якуба Коласа. З таго часу кніжкі Коласа былі са мною ўсюды. Памятаецца такі выпадак.

1941 год. Верасень. Трывожны і цяжкі час у жыцці краіны. Мурманск. Немцы прарвалі лінію фронту і падышлі на 28 кіламетраў да горада. Становішча склалася пагражальнае. Нас перакінулі да Кольскага заліва. Камісар Анатоль Усцінавіч Мірскі выклікаў мяне, як камсорга батарэі, і сказаў, што трэба пагаварыць з байцамі (дарэчы, выклікаў мяне яшчэ і таму, што ў батальёне было 70 працэнтаў беларусаў). Прамоўца я быў дрэнны. І тут успомніў, што ў мяне ёсць дзве кніжкі. Гэта зборнікі Я. Коласа і П. Труса. З імі я пайшоў да байцоў і пачаў чытаць дарэвалюцыйную і паслярэвалюцыйную лірыку Коласа. Пра Радзіму, пра сінявокую Беларусь, пра дарагую кожнаму сэрцу зямлю, якая стогне пад цяжкім ботам фашыстаў. Стаіўшы дыханне, слухалі байцы палымяныя радкі коласаўскай лірыкі. У многіх на вачах — слёзы.

Потым былі жорсткія баі. Але хлопцы прыходзілі па кніжкі. Часам прасілі мяне зноў пачытаць Коласа. Я рабіў гэта з вялікай ахвотай.

Упершыню я ўбачыў Якуба Коласа ў 1941 годзе на І пленуме Саюза пісьменнікаў. Шырокі, адкрыты лоб, выразныя дугі броваў над заўсёды ўдумлівымі вачыма, сетка дробных маршчын ля вачэй... Тыповы твар селяніна.

Гэтага чалавека цяжка ўявіць за сталом, заваленым рукапісамі. Яго рукам, здаецца, зручней трымаць плуг, а не аловак ці ручку. Яго вачам, бадай, прывычней азіраць жытнёвыя палі, чым прабягаць па радках кніжнай старонкі. Ці не таму, калі чытаеш яго кнігі, само народнае жыццё паўстае перад табою ва ўсёй сваёй шматграннасці.

Але, на жаль, у час гэтай першай сустрэчы мне не ўдалося пагутарыць з Якубам Коласам. Я, тады яшчэ пачынаючы пісьменнік, не адважыўся і марыць аб размове з песняром. І толькі многа пазней часта ездзіў на кватэру паэта, больш свабодна гутарыў з ім. Я бачыў, як клапаціўся Колас аб моладзі, аб яе творчым росце. І моладзь гарнулася да Коласа, плаціла за клопат і ўвагу да сябе адданай любоўю.

Колас любіў гаварыць. Асабліва пра жыццё: як расце хлеб, як ідзе ўборка ў калгасе, як справы ў вучоных. Гаварыў з радасцю або з глыбокім смуткам. Некаторыя, пагутарыўшы з ім, былі расчараваны. Яны чакалі размовы пра «высокія матэрыі», а пачулі... пра жыццё, пра тое, што хвалявала ў той час кожнага.

**Д. К. МІЦКЕВІЧ:** Іван Пятровіч закрануў адну важную асаблівасць — сялянскае паходжанне Якуба Коласа. Яно паклала адбітак на манеры бацькі і сказалася на яго характары. А прывычка да акуратнасці і пунктуальнасці вельмі спатрэбілася ў час яго вучобы ў семінарыі.

У бацькі быў вельмі строгі распарадак дня: уставаў рана, але і спаць клаўся таксама рана, не любіў сядзець, як некаторыя, да трох гадзін ночы. Першай і абавязковай работай раніцою была фізічная: сам сек дровы, ускопваў, калі трэба, агарод, зімой адкідваў снег. Потым садзіўся і адказваў на карэспандэнцыю. Пісем прыходзіла многа. Імкнуўся адказаць на ўсе, таму што ад гэтага часам залежаў лёс чалавека. Але бацька не толькі атрымліваў пісьмы. Кожны дзень да яго прыходзілі сяляне з рознымі скаргамі. Колас прымаў іх. І калі ён назначаў час, то вельмі не любіў, калі чалавек спазняўся, таму што сам быў надзвычай пунктуальны. Дом наш быў адкрыты для ўсіх цэлы дзень. Бацька не даваў пустых абяцанак, а дапамагаў чалавеку, як мог.

І яшчэ Іван Пятровіч вельмі правільна адзначыў, што Колас увесь час жыў сельскімі справамі.

Паэт вельмі любіў Стаўбцоўшчыну, асабліва ваколіцы Мікалаеўшчыны. Гэты цудоўны край яшчэ з дзяцінства запаў у яго душу. Але знайшлося ў сэрцы месца і другому кутку беларускай зямлі — Пухаўшчыне, яе людзям, з якімі Коласа звязала цесная дружба. І, помніцца, у час чарговай паездкі (а гэта было ў канцы кастрычніка) ён убачыў не ўбранае поле грэчкі. Бацьку гэта вельмі ўразіла і ўсхвалявала. «Як так можа быць? Няўжо пра гэта ніхто не ведае?» Не супакоіўся, пакуль не знайшлі адказных. Словам, яго цікавіла жыццё ва ўсіх яго праявах.

**А. А. ЛОЙКА:** Мікалай Фёдаравіч Турчановіч, дзед вядомага літаратуразнаўцы Уладзіміра Міхайлавіча Юрэвіча, быў калісьці выкладчыкам народнага вучылішча, дзе вучыўся Янка Купала, тады Іван Луцэвіч. У яго была багацейшая асабістая бібліятэка...

**У. М. ЮРЭВІЧ:** Сапраўды, бібліятэка майго дзеда налічвала каля 5 тысяч кніг. Пераязджаючы, яе перавозілі на трох падводах. Бібліятэка была агульнадаступная. Была тут і руская класіка, багаты раздзел прыродазнаўства (садоўніцтва, пчалярства, агародніцтва). І асобны раздзел — гісторыя палітыкі. Ён якраз найбольш цікавіў Івана Луцэвіча.

У час канікулаў дамоў Іван не паехаў, застаўся ў інтэрнаце. Турчановіч запрасіў яго прывесці да парадку бібліятэку. Іван згадзіўся і дапамог настаўніку. За гэта Мікалай Федаравіч падарыў яму томік Гогаля. Так Іван Луцэвіч далучыўся да бібліятэкі Турчановіча. Пазней ён часта бываў у іх, браў чытаць кнігі.

Першым выданнем, дзе надрукаваўся Янка Купала, была газета «Северо-Западный край». На маю думку, гэта не было выпадковым. Чатыры экземпляры яе захоўваліся ў Турчановіча, і Купала часта чытаў выданне. Дарэчы, у даследаванні таго, што чытаў Купала, яшчэ непачаты край. Думаецца, тут ёсць вялікае поле дзейнасці для вучоных.

**І. У. САЛАМЕВІЧ:** Калі размова зайшла аб даследаваннях, то трэба адзначыць, што ў гэтым плане многае робіць рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі і яе няштатныя аўтары. Мы рыхтуем да друку Энцыклапедычны даведнік Янкі Купалы. Гэта аднатомнае выданне, у якое ўвойдзе 3,5 тысячы артыкулаў. Іх аўтары раскажуць пра ўсе (больш за 1000) творы Янкі Купалы: калі напісаны, дзе друкаваліся, хто пераклаў на музыку, напісаў па іх карціны. Тут будуць змешчаны артыкулы пра сваякоў, знаёмых, з якімі сустракаўся паэт. Жыццё і творчасць песняра прадстаўлены як бы ў трох зрэзах: Купала і беларуская літаратура; Купала і народы Савецкага Саюза; Купала і сусветная літаратура.

**Я. Е. РАМАНОЎСКАЯ:** Супрацоўнікі музея Янкі Купалы таксама праводзяць вялікую работу па даследаванню жыцця і творчасці народнага песняра, па крупіцах збіраюць матэрыял аб ім.

Я праехала сцежкамі Купалы, сустракалася з людзьмі, якія ведалі яго, запісвала ўспаміны. Па магчымасці адшукваю яшчэ не знойдзеныя рукапісы, што часам зрабіць вельмі цяжка.

Кожны год музей Янкі Купалы прымае больш за 160 тысяч наведвальнікаў. Мы заўсёды імкнемся расказаць ім як мага больш пра гэтага цудоўнага чалавека, а таксама пра развіццё беларускай савецкай літаратуры. Мы ўпэўнены, што творы Янкі Купалы, як і творы Якуба Коласа, шырока вядомы не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой, асабліва ў братніх сацыялістычных рэспубліках.

**Г. ГЕРМАНАЎ (НРБ):** Я з Вамі цалкам згодны, Ядвіга Емяльянаўна. Наш чытач цікавіцца творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа даўно. Пралетарскі паэт і крытык А. Тодараў сцвярджае, што ў 1910 годзе ў нас ужо ведалі некаторыя іх творы. У час першай сусветнай вайны пазнаёміцца з творамі беларускіх паэтаў было цяжка. Да фашысцкай дыктатуры 1923 года ў Балгарыю пранікалі толькі асобныя артыкулы пісьменнікаў. Многія з іх друкаваліся ў камуністычным журнале «Накавальня». Творы Купалы і Коласа распаўсюджвала газета «Релеф» («Рабоче-литературный фронт»). У час другой сусветнай вайны перавозіць савецкую літаратуру ў Балгарыю не было магчымасці. І толькі ў канцы 1947 года камсамольская газета «Народна младеж» адна з першых стала друкаваць творы беларускіх песняроў. Выйшлі нават невялічкія кніжкі іх твораў: «Зборнік вершаў Я. Купалы» і «Зборнік вершаў Я. Коласа» пад рэдакцыяй вядомага пралетарскага паэта Х. Рудзўскага. Але гэтыя выданні даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Зараз у нас рыхтуюцца да выхаду ў свет «Выбраныя творы» Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Наогул, мне вельмі прыемна паведаміць, што ў апошнія гады назіраецца працэс пашырэння перакладу твораў беларускіх пісьменнікаў на балгарскую мову.

**У. А. НАВУМОВІЧ:** Прайшлі два дні работы канферэнцыі. У ёй прынялі ўдзел 150 вучоных рэспублікі, а таксама госці з Масквы, Валгаграда, Уфы, Данецка, Кіева, Ужгарада, Харкава, Алма-Аты, іншых навуковых цэнтраў нашай шматнацыянальнай краіны, прадстаўнікі Балгарыі.

Усяго заслухана звыш 100 дакладаў і паведамленняў, працавала 8 секцый. У іх знайшлі сваё асвятленне шматлікія праблемы: роля Купалы і Коласа ў развіцці сацыялістычнага рэалізму, традыцыі пісьменнікаў у савецкай літаратуры, уплыў народных паэтаў на развіццё беларускай літаратурнай мовы, стылістыка пісьменнікаў. Асаблівая ўвага была звернута на праблемы светапогляду ў творчасці мастакоў, пытанні народнасці, партыйнасці, ідэйнасці, на плённасць купалаўска-коласаўскіх традыцый у беларускай савецкай літаратуры. Шырокае асвятленне атрымалі праблемы перакладу твораў Купалы і Коласа на мовы іншых народаў, і ў першую чаргу народаў братніх рэспублік, дзе знайшлі сваё адлюстраванне набыткі, прынцыпы, метады купалаўска-коласаўскай школы перакладу.

**А. А. ЛОЙКА:** Мне здаецца, карыснай і змястоўнай была таксама і сённяшняя гутарка за «круглым сталом». Безумоўна, удзельнікі яе даведаліся шмат новага, цікавага пра вялікіх песняроў зямлі беларускай — Янку Купалу і Якуба Коласа.

Запісала **З. АЛЯШКЕВІЧ**, наш кар.

**Фота В. ШАЧАКА.**

# У другі раз

**ПЕРШАКУРСНІКІ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ ЗАВАЯВАЛІ КУБАК ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ».**

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ існуе добрая традыцыя: кожны год восенню праводзіць лёгкаатлетычны крос сярод першакурснікаў. Чацвёрты раз студэнты змагаліся за кубак газеты «Беларускі універсітэт». Першымі ўладальнікамі кубка былі студэнты хімічнага факультэта. Затым іх на п'едэстапе гонару змянілі журналісты. А мінулы год перамогу святкаваў гістарычны факультэт.

Гэтыя старты з'яўляюцца першымі вялікімі спаборніцтвамі для студэнтаў-пачаткоўцаў. Цяперашняе спартыўнае свята ўдалося. Цёплае сонечнае надвор'е ўстанавілася быццам спецыяльна для спаборніцтваў. Усе старты былі распісаны да мінуты. Упэўнена працавалі суддзі. Выдатны парад удзельнікаў... Заставалася чакаць слова першакурснікаў.

Перад спаборніцтвамі рабілася, як заўсёды, шмат прагнозаў. Адны аддавалі перавагу гістфаку, другія ставілі на першае месца ФПМ, трэція выводзілі ў лідэры юрыстаў. Многа шансаў было ў мехмата і хімфака. І, зразумела, усе «паважалі» журфак.

Правілы правядзення кубка своеасаблівыя. Кожны першакурснік можа выйсці на дыстанцыю, і таму гэтыя спаборніцтвы з'яўляюцца самымі масавымі ва універсітэце. Сёлета ўдзельнічала ў іх 885 дзяўчат і 415 юнакоў. 1300 чалавек, на 70 чалавек больш, чым у мінулым годзе!

У залік ідзе толькі 50 працэнтаў ад колькасці студэнтаў на курсе. Затым па спецыяльнай табліцы вылічваецца сярэдні рэзультат у ачках. Такім чынам, вынік залежыць ад укладу кожнага.

І яшчэ адна асаблівасць гэтых спаборніцтваў. Прэтэндэнтаў на перамогу было названа шэсць. Ні ў якім другім відзе спаборніцтваў столькі многа іх не бывае. Мы назвалі толькі тыя факультэты, якія заўсёды стабільна выступаюць, а марыць аб поспеху могуць усе. Тым больш, што магчымасці першакурснікаў невядомы. Крос і паказвае іх фізічную падрыхтоўку, адкрывае новых таленавітых спартсменаў.

На жаль, сёлета такіх адкрыццяў, як у мінулы год, было менш. Ужо ў першых стартах біёлагі паказалі нізкі рэзультат. І вынік не прымусіў сябе чакаць: апошняе месца. Біяфак амаль кожны год замыкае выніковую табліцу. Не вельмі многа выйгралі ў біёлагаў іх суседзі — студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі.

Доўгі час лепшыя вынікі ў бегу мужчын на кіламетр і дзяўчат на 500 метраў заставаліся ніжэй трэцяга разраду.



І толькі хлопцы гістарычнага факультэта ўклаліся ў трохмінутны рубеж.





Гісторыкаў падтрымалі. Павел Навайчык, студэнт філалагічнага факультэта, паказвае вынік: дзве мінуты 55 секунд. І філфак вырваўся ўперад, што не з'явілася нечаканасцю. Факультэт заўсёды нядрэнна выступаў у гэтых спаборніцтвах, уваходзячы ў пяцёрку мацнейшых.

Толькі цяпер пачала разгортвацца вострая спартыўная барацьба. Гэта было бачна па забегах юрыстаў. Моцна прабегла дыстанцыю Тамара Міраноўская — 1 мінута 28,2 секунды. Яна стала лідэрам у дзяўчат. Студэнты юрфака Анатоль Сусла і Юрый Шаўцоў змаглі абагнаць П. Навайчыка (адпаведна 2 мінуты 53 секунды і 2 мінуты 50,8 секунды. Шаўцоў, Сусла і Навайчык склалі тройку прызёраў.

Добра пастараліся лідэры юрфака. Але іх не падтрымалі астатнія. Большая частка хлопцаў і дзяўчат не ўклалася ў нарматывы ГПА. У залік ішлі зусім слабыя рэзультаты. Таму камандзе нельга было разлічваць на перамогу.

Наступнымі выступалі студэнты ФПМ. Тыя, хто ўважліва сочыць за ходам спартакіяды універсітэта, добра памятаюць, як цудоўна выступіла каманда факультэта ў мінулым годзе. Тады ФПМ зусім нямнога прайграў пераможцу. Цяперашнія першакурснікі ФПМ прадэманстравалі высокую арганізаванасць. Але ў камандзе не было такіх выдатных бегуноў, як летась. Тым не менш факультэт часова стаў лідэрам.

Механіка-матэматычны і хімічны факультэты змаглі толькі прыблізіцца да ФПМ. Студэнтка мехмата Аксана Люцко паказала вынік—1 мінута 23 секунды і заняла другое месца. А перамагла Ала Трахоўцава, першакурсніца хімфака, з вынікам, які перавышае другі разрад,— 1 мінута 22 секунды. Яна паўтарыла рэкорд кубка, які ў мінулым годзе ўстанавіла студэнтка юрфака Іра Данільчанка.

Апошнім стартаваў факультэт журналістыкі. Гавораць, што ён пастаўлены ў прывілеяванае становішча ў кросе. Маўляў, студэнтаў мала, і лёгка атрымаць высокі сярэдні рэзультат. Думаю, што гэта не так. Пры такіх правілах правядзення ўсе факультэты знаходзяцца ў аднолькавым становішчы. Перамагае той, хто больш адказна падыдзе да спаборніцтваў. Паглядзіце на заўсёды высокія месцы ФПМ, мехмата. А журфак? Першы раз журналісты абыякава аднесліся да старту і былі апошнімі. Наступны раз каманда заняла першае месца дзякуючы добрай дысцыпліне. Мінулы год стаў для факультэта зноў няўдалым — падвялі самі ж студэнты.

Цяпер журфак спадзяваўся на перамогу. Хто знаходзіўся на стадыёне, той бачыў, як журналісты сабраліся ўсе разам і слухалі парады памочніка дэкана факультэта па фізвыхаванню Людмілы Канстанцінаўны Артамонавай, якая паставіла адну мэту: перамагчы.

І каманда перамагла, устанавіўшы яшчэ адзін рэкорд гэтых спаборніцтваў: другі раз заваявала кубак нашай газеты. Хочацца верыць, што перамога натхніць спартсменаў журфака і яны змогуць паспяхова выступіць у астатніх спаборніцтвах спартакіяды.

— Спартыўнае свята ўдалося,— гаворыць галоўны суддзя В. В. Зарэцкая.— Добрае слова хочацца сказаць у адрас суддзяў, выкладчыкаў кафедры фізвыхавання А. С. Харэвіча, Р. В. Кандратавай, А. М. Чурак, студэнтаў юрфака Р. Заброцкага, ФПМ В. Корабава і Н. Бліновай. Рэзультаты першакурснікаў некалькі слабейшыя, чым у мінулым годзе. Быў дасягнуты ўсяго адзін раз рубеж другога разраду, восем — трэцяга. Толькі 320 студэнтаў выканалі нарматывы ГПА.

Прыводзім выніковую табліцу спаборніцтваў на кубак газеты «Беларускі універсітэт» (у дужках — колькасць ачкоў, якія ідуць у залік спартакіяды):

| | |
|---|---|
| **1. журфак** | [180] |
| **2. ФПМ** | [155] |
| **3. мехмат** | [140] |
| **4. хімфак** | [120] |
| **5. філфак** | [100] |
| **6. гістфак** | [90] |
| **7. юрфак** | [80] |
| **8. геафак** | [70] |
| **9. фізфак** | [60] |
| **10. радыёфізікі і электронікі** | [50] |
| **11. біяфак** | [40] |

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

## СТАРТУЮЦЬ СУПРАЦОЎНІКІ

НА МІНУЛЫМ тыдні адбыўся лёгкаатлетычны крос па праграме спартакіяды «Здароўе» Мінскага абласнога спартыўнага таварыства «Буравеснік» сярод супрацоўнікаў ВНУ. Каманда універсітэта выступіла даволі ўдала. Ніхто не мог саставіць канкурэнцыі выкладчыцы кафедры фізічнага выхавання А. М. Чурак, якая прабегла 500 метраў з вынікам 1 мінута 24,6 секунды. Чэмпіёнку падтрымалі яе таварышы па кафедры М. М. Тарасава і Л. К. Артамонава. Яны занялі адпаведна другое і трэцяе месцы на дыстанцыі 300 метраў. Супрацоўнік хімічнага факультэта А. П. Кузнечык зусім мала ўступіў пераможцу на дыстанцыі 800 метраў. У агульнакамандным заліку БДУ заняў першае месца, абагнаўшы калектывы БПІ і Інстытута замежных моў.

## ...І СТУДЭНТЫ

ПАСПЯХОВА завяршыўся для студэнцкай каманды універсітэта абласны крос спартыўнага таварыства «Буравеснік». У камандным заліку БДУ заняў другое месца. Чэмпіёнка Белсавета ДСТ «Буравеснік» студэнтка мехмата Галіна Хадаркевіч была другой на дыстанцыі 500 метраў з вынікам 1 мінута 24 секунды. Усяго секунду прайграла ёй студэнтка фізфака Ала Пількова, якая фінішыравала трэцяй. Студэнт ФПМ Андрэй Міхейкін быў першы на трохкіламетровай дыстанцыі—8 мінут 30 секунд. А пяцікурсніца гэтага ж факультэта Таццяна Крупянкова была трэцяй у бегу на два кіламетры.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ,**
**студэнт журфака.**

## СПАРТАКІЯДА

замежных навучэнцаў праходзіць ва універсітэце. Адбыліся спаборніцтвы па баскетболу. У фінал выйшлі першая і другая каманды Кубы і каманда Мадагаскара. На працягу лістапада таксама пройдуць спаборніцтвы па валейболу, міні-футболу, настольнаму тэнісу. Гэта спартыўнае мерапрыемства мае сваёй мэтай падрыхтоўку да 9-й гарадской спартакіяды замежных навучэнцаў.

**А. ЯФІМАЎ,**
**выкладчык.**

## ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

агляду-конкурсу па спартыўна-масавай рабоце і XXX спартакіяды універсітэта за 1981-82 навучальны год. У аглядзе-конкурсе месцы размеркаваліся наступным чынам: I—юрфак, II—філфак, III — механіка-матэматычны факультэт.

Вынікі XXX спартакіяды таксама сталі прыемнымі для студэнтаў юрыдычнага факультэта. Яны занялі I месца, механіка-матэматычны факультэт—II, а ФПМ—III.

**А. БАЛДЗІН,**
**старшыня спортклуба.**



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

4 лістапада 1982 г.
Зак. 1942 АТ 21557

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ